ДУК “САЛІГОРСКАЯ РАЁННАЯ ЦЭНТРАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА”
АДДЗЕЛ МАРКЕТЫНГУ, САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ
І МЕТАДЫЧНАЙ РАБОТЫ

# Міхась Лынькоў



МЕТАДЫЧНЫЯ ПАРАДЫ

ДА 125-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ПІСЬМЕННІКА

ПРАЗАІК, ДЗІЦЯЧЫ ПІСЬМЕННІК, КРЫТЫК, ЛІТАРАТУРАЗНАВЕЦ, ГРАМАДСКІ ДЗЕЯЧ

2024

*Празаік, дзіцячы пісьменнік, крытык, літаратуразнавец, грамадскі дзеяч. Народны пісьменнік БССР (1962). Акадэмік АН БССР (1953). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1968).*



Міхаіл Ціханавіч Лынькоў нарадзіўся 30 лістапада 1899 года ў вёсцы Зазыбы Віцебскага павета Віцебскай губерні ў сям'і чыгуначніка. Сям'і Лыньковых даводзілася шмат пераязджаць і часта змяняць месца жыхарства. Дзіцячыя гады правёў у казарме на перагоне між станцыямі Магілёў і Лотва, потым у чыгуначнай будцы на перагоне між станцыямі Тошчыцы і Рагачоў. Але неўзабаве бацька Лынькова атрымаў пасаду пуцявога абходчыка. У школу пайшоў у вёсцы Старое Сяло пад Рагачовам. Скончыў двухкласную школу пры Рагачоўскай настаўніцкай семінарыі, а ў 1917 г. і саму семінарыю. Падзарабляў на чыгунцы, даваў прыватныя ўрокі. Настаўнічаў у Ліпініцкай земскай школе (цяпер Буда-Кашалёўскі раён).



*Хата, у якой жыў у дзяцінстве М.Лынькоў.*

У 1919-1922 гг. служыў у Чырвонай Арміі. Удзельнічаў у савецка-польскай вайне, ваяваў з атрадамі С. Булак-Балаховіча. Пасля дэмабілізацыі настаўнічаў у вёсцы Свержань Рагачоўскага раёна. У 1925-1928 гг. – адказны сакратар рэдакцыі, намеснік рэдактара, у 1928-1930 гг. – рэдактар бабруйскай акруговай газеты «Камуніст». Арганізатар і кіраўнік Бабруйскага філіяла «Маладняка», быў адным з кіраўнікоў Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў (БелАПП). У 1930 г. пераехаў з Бабруйска ў Мінск. Працаваў у Дзяржаўным выдавецтве БССР (1930-1932), быў сакратаром аргкамітэта



*Алёна Амяльянаўна і Ціхан Васільевіч Лыньковы з дзецьмі Грышам, Мішам, Поляй, Ганнай і Колем. 1917г.*

Саюза пісьменнікаў Беларусі (1932-1934) гг.), старшынёй праўлення Саюза пісьменнікаў БССР (1938-1948 гг.) З 1934 па 1941 г. рэдагаваў часопіс «Полымя рэвалюцыі». Удзельнік паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь (1939), рэдагаваў газету «Беларуская звязда» – орган палітупраўлення Беларускага фронту. У 1941-1942 гг. – рэдактар франтавой газеты «За Савецкую Беларусь» (выходзіла на Заходнім, Цэнтральным і Бранскім франтах). У час вайны друкаваўся ў газетах «Правда», «Известия», «Раздавім фашысцкую гадзіну» і інш. У 1943-1946 гг. і 1949-1952 гг. – дырэктар Інстытута літаратуры, мовы і мастацтва АН БССР. Выбіраўся кандыдатам у члены ЦВК БССР (1921-1931 гг.), дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР 1-га склікання (1940-1945). У складзе дэлегацый БССР неаднаразова ўдзельнічаў у працы сесій Генеральнай Асамблеі ААН. У Саюзе пісьменнікаў СССР з першага года ўтварэння (1934).



*Міхась Лынькоў, Макар Паслядовіч, Янка Купала, Максім Танк, Пятрусь Броўка і Яніна Бранеўская. 1940г.*

Пачаў друкавацца з 1919 г. Выступіў у друку з апавяданнямі ў 1926 г. Выдаў зборнікі прозы «Апавяданні» (1927), «Гой» (1929), «Андрэй Лятун», «Апошні зверыядавец» (абодва – 1930), «На вялікай хвалі» (1934), «Баян» (1935), «Сустрэчы» (1940), «Астап» (1944) і інш. Аўтар раманаў «На чырвоных лядах» (1934), «Векапомныя дні» (1958, 2-е перапрац. выд. – 1969). Напісаў нарыс «Герой Савецкага Саюза Канстанцін Заслонаў» (1944). Аўтар кніг для дзяцей «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў» (1937), «Міколка-паравоз» (1937), «Янка-парашутыст» (1937), «Ядвісін дуб» (1940) і інш. Міхасю Лынькову належаць літаратуразнаўчыя працы «Беларуская літаратура за 30 год» (1948, на беларускай і рускай мовах), «Якуб Колас» (1952), «Летапіс эпохі: Беларускай савецкай літаратуры пяцьдзясят год» (1968). зборнікі «Літаратура і




*Вокладка першага зборніка Міхася Лынькова "Апавяданні".*

жыццё» (1978), «Публіцыстыка» (1980). Выйшлі Зборы твораў у чатырох (1967-1968) і васьмі (1981-1985) тамах.

Узнагароджаны трыма ордэнамі Леніна, трыма ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Пераклаў на беларускую мову асобныя творы А. Гідаша, М. Горкага, М. Ціханава і інш. Імем Міхася Лынькова названы вуліцы ў Мінску і Бабруйску, у пасёлку Лужасна Віцебскага раёна, яго імя носіць Крынкаўская сярэдняя школа Лёзненскага раёна, мемарыяльныя дошкі ўсталяваны ў Мінску на доме № 12 на праспекце Незалежнасці, дзе жыў народны пісьменнік, на доме № 1 па вуліцы Міхася Лынькова, у Бабруйску на будынку, дзе месцілася рэдакцыя газеты «Камуніст».



*Юбілейная манета Нацбанка Беларусі ў гонар 100-годдзя з дня нараджэння М. Лынькова.*

Памёр 21 верасня 1975 г., пахаваны на Усходніх могілках у Мінску.

## Рэкамендуем правесці мерапрыемствы, прысвечаныя М. Лынькову:

- “Жыццёвымі сцежкамі пісьменніка”: *агляд творчасці*
- “Прамяністае святло таленту”: *літаратурная гадзіна*
- “Міхась Лынькоў: чалавек-легенда”: *літаратурны вечар*
- “Векапомныя дні Міхася Лынькова”: *творчы партрэт*
- “Несці нашчадкам у сэрцы родную мову”: *гутарка-знаёмства з творчасцю пісьменніка;*
- “Дар душэўнай дабрыні”: *літаратурная вечарына*
- “Міхась Лынькоў – чалавек-легенда”: *кніжная выстава*
- “Прасторы творчасці”: *літаратурны вечар*
- “Міхась Лынькоў: “…мой жыццёвы і творчы шлях”: *вечар-партрэт*

## Сцэнарый юбілейнай вечарыны да 125-годдзя з дня нараджэння Міхася Лынькова

***1-вяд.***

ВІТАЕМ УСІХ ПРЫСУТНЫХ У ГЭТАЙ ЗАЛЕ!

Наш сённяшні вечар прысвечаны Міхасю Ціханавічу Лынькову

***2-вяд.***

Аднаму з заснавальнікаў беларускай мастацкай прозы

***1-вяд.***

Удумліваму мастаку, чалавеку вялікай душэўнай абаяльнасці, незвычайнай сціпласці.

***2-вяд.***

Самаадданаму сыну беларускай зямлі.

***1-вяд.***

Народнаму пісьменніку Беларусі, акадэміку, пісьменніку-гуманісту, нястомнаму рамантыку. Міхась Ціханавіч Лынькоў нарадзіўся 18-га лістапада (30-га па новым стылі) 1899 года ў весцы Зазыбы на Віцебшчыне. Галадуха, нішчымніца выгналі з роднай вескі бацькоў працаваць на чыгунку. Нялегкім быў пачатак яго дарогі. Самыя першыя дзіцячыя ўражанні – гэта ужо ўсведамленне адказнасці, абавязку перад маці, перад малодшымі ў сям’і, сям’і рамонтнага рабочага, якая мясцілася ў чыгуначнай будцы, што стаяла на перагоне паміж Тошчыцай і Рагачовам на 230-й вярсце. Гэтую вярсту і тое, што бацька атрымліваў 12 рублеў 20 капеек, а маці, пераездная вартаўніца, – 3 рублі на месяц, будучы пісьменнік запомніў на ўсе жыццё. Ад чыгуначнай будкі дорога вяла ў лес. Душой лавіў Міхась шматгалоссе лесу, сэрцам убіраў жывыя галасы роднай зямлі. У лазовай балаціне спявала-плакала жалейка.

*(Музычны нумар)*

*(Ціха гучыць мелодыя песні “Маці мая, Беларусь", Муз. Л Кос-Антакэльскага, сл. М. Танка)*

***2 чыт.***

Зрэзаў чалавек чараціну, падзьмуў у яе: пачулі кусты, лугавіны. Зрэзаў хваінку, зрабіў дудачку, дыхнуў у яе, зайграла яна: пачулі яе бярэзнікі, сасоннікі... Зрэзаў елку, зрабіў скрыпку, зайграў-заспявалі, заскакалі людзі на вяселлі, на радзінах, на кірмашах... Па ўсім краі крынічанькай разлілася, галубкай паляцела песня.

***1 чыт.***
Кожнае слова сэрцам лавіў хлопчык, а маці ягады збірала, расказвала.
***2 чыт.***
Песні – гэта залатыя чарадзейныя ключы, якімі адмыкаюцца нават дрымотныя, цемныя душы. Заспяваешь – мядзведзь перастае маліну збіраць, прыслухоўваецца да песні. Нават конь робіцца весялейшым, калі заспяваюць вянчальную, вясельную.
***1 вяд.***
Добрыя, цудадзейныя зярняты маці пасеяла ў душы сына. Прарастуць яны, закрасуюць, закалосяцца жывымі словамі, раманамі, аповесцямі, апавяданнямі, вершамі.
*(музыка сціхае)*
***2 вяд.***
Дарэчы, усе тры браты Лыньковы пісалі вершы. З вершаў пачынаў і Міхась, які падпісваўся псеўданімам Васілек, сярэдні назваў сябе Рыгор Суніца. Не адстаў і Мікола, самы меншы брат – у школе, потым у тэхнікуме ен быў актыўным паэтам, аўтарам усіх насценных газет, а псеўданім сабе ен выбраў яшчэ задоўга да славутай братавай аповесці – “Міколка Паравоз!”.
***1 вяд.***
Як пісьменнік Міхась Лынькоў не хадзіў ў пачаткоўцах і вучнях, а з першых публікацый было ясна – ў літаратуру прыйшоў сталы пісьменнік, патрабавальны, чуйны майстра.
***2 вяд.***
Ён прыйшоў у літаратуру не вучнем, а настаўнікам, выхавальнікам рабселькораўскай моладзі. Такія вядомыя сення пісьменнікі і паэты, як Хвядос Шынклер, Барыс Мікуліч, Васіль Вітка, Сяргей Грахоўскі, Аляксей Зарыцкі ўвайшлі ў літаратуру, падтрыманыя яго добрым словам.
***1 вяд.***
Будучы яшчэ зусім маладым чалавекам, аўтарам двух невялікіх зборнікаў “Гой” і “Над Бугам” Міхась Лынькоў заявіў аб сабе як сталы майстра. Яго апавяданні тых гадоў адразу атрымалі шырокую вядомасць.

***2 вяд.***

Ніл Гілевіч сказаў: “Калі мае пакаленне яшчэ толькі асвойвала школьны буквар, Міхась Ціханавіч быў ужо вядомым, прызнаным і вельмі папулярным пісьменнікам. Гэта значыць, што, як і ўсе мае аднагодкі, я не мог размінуцца і не пазнаеміцца – ў аднабаковым парадку – з ім. Так, размінуцца было немагчыма, таму што Лынькоў быў усюды і скрозь: яго кнігамі літаральна зачытваліся, асабліва дзеці, школьнікі і моладзь.

***1 вяд.***

“Да вайны я прачытаў ўсе, што пісаў і выдаваў Міхась Ціханавіч. Чытаў і перачытваў. Маё захапленне пачыналася ад саміх назваў твораў. Яны мне заўсёды здаваліся незвычайнымі і як бы таямнічымі: “Апошні зверыядавец”, “Наталка-шкрабалка”, “Чыгунныя песні”, “Манчжур",” “Гой", “Баян”, “Беня-балагол". А многія выслоўі і дасюль жывуць у памяці: эх, позна, позна, і так рана рана; нос у цябе, браце, не нос, а замок ад гарматы; за вочы быў Мядзведзь, а ў вочы Андрэй Андрэевіч; эх, Андрэй, Андрэй, да чаго ж ты дажыў, да чаго дастукаўся”, – успамінае пісьменнік Алесь Асіпенка.

***2 вяд.***

У розных празаічных жанрах пісаў Міхась Лынькоў, асабліва многа зрабіў ён для развіцця жанру беларускага апавяданая. Яго апавяданні вызначаліся навізной тэматыкі, значнасцю ўзнятых праблем, змястоўнасцю чалавечых характараў, арыгінальнай мастацкай манерай.

***1 вяд.***

Міхась Лынькоў ўслаўляў героіку рэвалюцыі і грамадзянскай вайны.

***2 вяд.***

Ранняя творчасць Міхася Лынькова – гэта рытмічная проза, эмацыянальная, яркая, багатая метафарычнасцю, акрыленая, рамантычнай прыўзнятасцю. (Чытаецца ўрывак з апавядання “Маладосць”).

***1-ы чыт.***

Светлая раніца ўсміхнулася гораду. Сонечныя блескі ігралі з лісцем ліп і клёнаў, рассыпаліся зайчыкамі па шыбах акон, залацілі шыльды, падфарбоўвалі дахі камяніц. Грымелі гарачай меддзю трубы, і выбухі барабана ўзляталі вышэй сонечных сцен... Людзі

ішлі на фронт. Адна за другой праходзілі калоны. Людзі тоўпіліся на тратуарах, праводзілі. Большасць воч прамянілася сонцам, сонечнай радасцю, сонечным сумам. Развіталіся са сваімі роднымі, блізкімі. Толькі дзе-нідзе, за прыспушчанымі фіранкамі, холадна паблісквалі чужыя вочы, сутуліліся чужыя спіны.

***Дзяўчына:***

Васька ішоў у пярэдніх калонах. Ён старанна адбіваў крок, беражна нёс вінтоўку. На яе штыку красавалася гваздзіка. Нехта з праводзіўшых – ці то дзяўчына, ці то стары, а мо і родная маці, хіба ўспомніш цяпер, надарылі яго гэтай маленькай кветкай, пахучай, свежай. Яшчэ не высахла кропелька расы на яе бархатнай чырвані. Васька ішоў і не адчуваў хады свае, да таго легка ісці, калі музыка, калі песні, калі солнца іскрыцца на палотнішчах сцягоў, на тварах людскіх, у думках, надзеях. Спыніліся на вакзале. Ішла пасадка ў доўгі цягнік.

***Юнак:***

Васька стаяў ля самых дзвярэй вагона / Васька бярэ дзяўчыну за руку/. Ён трымаў за руку Насцю і нібы думаючы аб чым далекім, глядзеў кудысьці ўздоўж цягніка, туды, дзе пабеглі бясконцыя рэйкі, куды памчыць іх цяпер чырвоны цягнік. І калі пачуўся другі званок, неяк схамянуўся Васька, горача пацiснуў Насціну руку, зазірнуў ей ў вочы – сур’езныя цяпер, спакойныя, не смяшлівыя. І раптам засмяяўся.

***Юнак звяртаецца да дзяўчыны:*** “Якія ж мы з табой важныя, якія мы сур’ёзныя, проста холодна робіцца.... Падумаешь, разлука, ты разлука... Хіба навек растаемся? Аднак наведвай часцей маці... няхай не сумуе...”

***1 вяд.***

Пацалаваліся горача, не саромяючыся людзей.

*(Хлопец і дзяўчына махаюнь адзін аднаму і ідуць у розныя бакі)*

*Гучыць мелодыя песні “Там вдалі за рекой”*

*(На сцэну выходзіць дзяўчына, на галаве або ў руках чорная хусцінка)*

***2 вяд. /з болем, спачуваннем/***

Пахавалі Ваську на ўскрайку лесу, дзе стаялі ў задуме суровыя сосны, дзе зямля была ўсыпана ігліцай. Плыло над соснамі спакойнае восеньскае сонца, залаціла свежы пясок, хвойнае голле

над долам. Тугою гудзелі вершаліны хвой, адвечны шум баравы плыў над лесам, развітваўся з Васькам.
*(Музыка сціхае)*
Апранулі яго ў новую адзежу. Усе, што было лепшага ў роце і пралетарскім батальоне, адшукалі хлопцы для Ваські. І ляжаў ён, святочны, урачысты. І здавалася, хітрун ён, хоча абмануць дружбакоў сваіх. Вунь хлапечая ўсмешка захавалася пад непакорлівымі віхрамі. Нібы жывы, глядзіць, узіраецца ён, прыжмурыўшыся, у залатое сонцава вока... Ляжыць і марыць... А ў глыбокай бездані неба плывуць журавы, ледзь даносіцца іх развітальнае - курлы... курлы...
***1 вяд. /хлопец/***
Зайграла музыка. Адразу падцягнуліся хлопцы. Не зварухнецца іх строй суровы, аж рукі ўліпнулі ў вінтоўкі.
***2 вяд.***
Гарэлі сэрцы ад слоў палымяных
***1 вяд.***
Пралітая намі кроў не загіне дарма...
***2 вяд.***
Высока-высока ў небе курлыкалі журавы...

--------------------------------------

***1 вяд.***
Міхась Лынькоў вельмі любіў дзяцей, разумеў іх душу. Для іх ён напісаў такія творы як “Міколка-паравоз”, “Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў”, “Янка-парашутыст” і інш. Без вялікай любві і павагі да дзяцей, без дасканалага ведання дзіцячай псіхалогіі такія рэчы напісаць немагчыма. У творах для дзяцей асабліва адчувальна выявіўся ўласцівы Міхасю Лынькову дасціпны гумар.
*(чытаецца ўрывак з аповесці “Міколка-паравоз”).*
***2 вяд.***
Пад час Вялікай Айчыннай вайны пісьменніку давялося перажыць нечалавечыя пакуты: ягоную жонку і сына Марыка растралялі фашысты. Боль гэты не загаіўся ў душы пісьменніка да канца жыцця. Востра адчуваецца ён у ваенных апавяданнях Міхася Лынькова

“Васількі”, “Дзіцячы башмачок”, “Недапетыя песні”, “Пацалунак”, у ваеннай публіцыстыкі.

***2 вяд.***

Велічны подзвіг народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны пісьменнік увасобіў у рамане-эпапеі “Векапомныя дні”.

***1 вяд.***

“Я меў на ўвазе расказаць чытачу аб тым, як наш беларускі народ, нягледзячы на люты тэрор фашыстаў, не скарыўся ворагу, не стаў перад ім на калені... Я хацеў расказаць аб мужнасні і гераізме народа.... Якімі б ні былі рознымі людзі па сваіх ранейшых занятках, па ўзросту, па культурнаму ўзроўню, па сваіх звычках і схільнасцях – усіх іх аб’ядноўвала палымяная любоў да Радзімы, палаючая нянавісць да ворага, страстнае жаданне як мага хутчэй разбіць ворага і вызваліць ад яго родную зямлю” – пісаў пісьменнік.

***2 вяд.***

Творчае майстэрства Міхася Лынькова было добрай школай для станаўлення многіх пісьменнікаў больш позняга часу. Еўдакія Лось з удзячнасцю пісала: “Праходзячы школу Лынькова (маю на ўвазе ўсю яго творчасць, творы ваеннай пары, эпапею “Векапомныя дні”), вучышся не толькі таму, як напісаць сказ, пабудаваць сюжэт, намаляваць вобраз. Вучышся гуманізму – усеперамагаючай любві да чалавека, працаўніка і змагара за праўду і справядлівасць. Вучышся інтэрнацыяналізму, без якога немагчыма хада чалавецтва...... Вучышся любві да зямлі, якая цябе ўзгадавала, дала табе мову. Вучышся дабраце...”

*(гучыць мелодыя песні “Жураўлі”)*

***2 вяд.***

Закончыць нашу вечарыну памяці Міхася Лынькова, народнага пісьменніка Беларусі, мастака прамяністага таленту і душы мы хочам прысвячэннем Максіма Танка:

Міхась!...
Зачынена акно. Няўжо ён яшчэ спіць.
Хаця ў чаўне зары
На наш бераг
Ужо вяслуе ранак?
Міхась!...
Няўжо забыўся ён,

Што сёння меліся
Рыбацкае мы шчасце паспытаць?
Ці ноч правёўшы
З героямі
Сваіх апавяданняў
Замарыўся на золаку сном?
.....А можа,
Размінуліся мы з ім
І ен раней адплыў
На Гатаўскія тоні?
- Яшчэ аклікну раз
І паплыву шукаць......

## Творы Міхася Лынькова




Лынькоў, М. Збор твораў : у 8 т. Т.4. Векапомныя дні : раман у 4-х кн. кн.1-2 / М. Лынькоў ; рэдкал. : В. В. Барысенка [і інш.] ; АН БССР. Ін-т літ. імя Я. Купалы. - Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 671 с., 3 л. іл. : іл.

Лынькоў, М. Збор твораў : у 8 т. Т.5. Векапомныя дні : раман у 4-х кн. кн.3-4 / М. Лынькоў ; рэдкал. : В. В. Барысенка [і інш.]; АН БССР. Ін-т літ. імя Я. Купалы. - Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 715 с. : іл.

Усенародная партызанская барацьба паказана ў рамане-эпапеі «Векапомныя дні» (1948-1958). Гэта самы маштабны ў беларускай літаратуры твор аб партызанскай вайне на тэрыторыі Беларусі. Раман складаецца з чатырох кніг. Любоўна, з душэўнай зацікаўленасцю малюе аўтар сваіх герояў – беларускіх партызан і падпольшчыкаў, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Жыццё ва ўмовах нямецка-фашысцкай акупацыі, жорсткасць, зверствы гестапаўцаў і бясстрашнасць, знаходлівасць, гераізм савецкіх партызан-разведчыкаў – усё гэта знайшло яркае, шматпланавае адлюстраванне ў рамане. Вельмі паэтычна і разам з тым праўдзіва малюе пісьменнік лірычныя перажыванні сваіх герояў. Разам узятыя, героі рамана ствараюць калектыўны вобраз народа-змагара, які не зламаўся, не стаў на калені перад ворагам.



Лынькоў, М. Выбраныя творы / Міхась Лынькоў ; [укладанне, прадмова і каментар Дзмітрыя Бугаёва]. – Мінск : Беларуская навука, 2013. – 556 с. – (Беларускі кнігазбор. Мастацкая літаратура).

У кнігу ўключана ўсё самае значнае з творчай спадчыны пісьменніка – творы, дзе найбольш ярка праявіўся талент Міхася Лынькова. Асобнае месца займаюць апавяданні, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне. Апавяданне «Васількі». Галоўны герой трынаццацігадовы хлопчык Міколка, помсцячы за смерць маці і хворай сястрычкі, кідае супрацьтанкавую гранату ў аўтобус з эсэсаўцамі і сам гіне ад фашысцкай кулі. Апавяданне “Салют”. Юнак

Алёша за смерць сваей каханай ператварае ў магілу памяшканне, дзе фашысты наладзілі баль. Апавяданне “Ірына”. Льнаводка Ірына ўзрывае цягнік з салдатамі і боепрыпасамі і гіне сама, помсцячы за смерць свайго маленькага сына. Міхась Лынькоў паказвае, што героі яго пры выкананні небяспечных заданняў кіраваліся не толькі жаданнем помсціць за асабістае гора, але і пачуццём агульнай адказнасці перад Радзімай, якую топча вораг.




Лынькоў, М. Над Бугам : выбранае / М. Лынькоў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2002. – 446 с.

У зборнік увайшлі лепшыя творы Міхася Лынькова. Апавяданне “Астап”. У ім пісьменнік расказвае пра гераічнае змаганне беларускага народа супраць фашысцкай навалы. На барацьбу супраць фашыстаў узнімаюцца ўсе жыхары краіны, для якіх лепш загінуць, чым жыць у няволі. Стары ляснік Астап паўтарае подзвіг Івана Сусаніна.

## Творы Міхася Лынькова

Лынькоў, М. Збор твораў : у 8 т. / Міхась Лынькоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981 – 1985. – 8 т.

Лынькоў, М. Выбраныя творы / Міхась Лынькоў. – Мінск : Беларуская навука, 2013. – 556 с., [4] л. фот. – (Беларускі кнігазбор).

Лынькоў, М. Міколка-паравоз : аповесць / Міхась Лынькоў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2018. – 123, [2] с.

Лынькоў, М. Над Бугам : выбранае / Міхась Лынькоў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2002. – 446 с. – (Беларуская проза XX стагоддзя).

Лынькоў, М. Насустрач жыццю : апавяданні : [для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту] / Міхась Лынькоў. – Мінск : Юнацтва, 1988. – 255 с., 1 л. партр. – (Школьная бібліятэка).

Лынькоў, М. Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў : аповесць і апавяданні : [для малодшага школьнага ўзросту] / Міхась Лынькоў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2003. – 131 с. : каляр. іл.

Лынькоў, М. Сустрэчы : апавяданні, аповесць : [для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту] / Міхась Лынькоў ; [укладальнік, прадмова, каментарый М. Кенькі]. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1996. – 302 с. : іл.

Лынькоў, М. Творы / Міхась Лынькоў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2017. – 676, [2] с. – (Залатая калекцыя беларускай літаратуры ; т. 14).

## Аб жыцці і творчасці пісьменніка

Лынькоў Міхась // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1999. – Т. 9. – С. 383.

Лыньков Михась // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. – Минск, 2007. – Т. 4. – С. 575.

Лынькоў Міхась // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т]. – Мінск, 2014. – Т. 5. – С. 171.

Лынькоў Міхась // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск, 1997. – Т. 4. – С. 407.

Лынькоў Міхась // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. – Мінск, 1986. – Т. 3. – С. 310–311.

Лынькоў Міхась // Тэатральная Беларусь : энцыклапедыя : у 2 т. – Мінск, 2003. – Т. 2. – С. 33.

Лынькоў Міхась // Беларусь : энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 1995. – С. 440.

Лынькоў Міхась Ціханавіч // Беларуская мова : энцыклапедыя. – Мінск, 1994. – С. 322–324.

Лынькоў Міхась // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік : у 6 т. / [пад рэдакцыяй А. В. Мальдзіса]. – Мінск, 1994. – Т. 4. – С. 117–130.

Лынькоў Міхась // Беларускія пісьменнікі (1917–1990) : даведнік / [складальнік А. К. Гардзіцкі]. – Мінск, 1994. – С. 348–49.

*****

Кенька, М. П. Міхась Лынькоў : летапіс жыцця і творчасці // М. П. Кенька ; [прадмова М. І. Мушынскага]. – Мінск : Універсітэцкае, 1987. – 175 с., 1 л. партр.

Куляшоў, Ф. Міхась Лынькоў : нарыс жыцця і творчасці : [для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту] / Фёдар Куляшоў. – Мінск : Народная асвета, 1979. – 191 с.

Святло яго душы : успаміны пра Міхася Лынькова / [складальнікі: С. Лынькова-Куспіц, Ю. Пшыркоў]. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1979. – 368 с., 1 л. партр.

*****

Міхась Лынькоў // Беларуская дзіцячая літаратура : [вучэбны дапаможнік / А. М. Макарэвіч і інш.] ; пад агульнай рэдакцыяй А. М. Макарэвіча, М. Б. Яфімавай. – Мінск : Вышэйшая школа, 2008. – С. 242 – 267.

Бугаёў, Д. Сэрца ў яго сапраўды было шчодрае : (Міхась Лынькоў : пісьменнік і час) / Дзмітрый Бугаёў // Служэнне Беларусі : праблемныя артыкулы, літаратурныя партрэты, эсэ, успаміны / Дзмітрый Бугаёў. – Мінск, 2003. – С. 169 – 180.

Каваленка, В. А. Міхась Лынькоў, 1899–1975 / В. А. Каваленка // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Інстытут літаратуры імя Я. Купалы ; [рэдакцыйная калегія: У. В. Гніламёдаў і інш. ; навуковыя рэдактары: У. В. Гніламёдаў, В. А. Каваленка]. – Мінск, 2002. – Т. 2. – С. 370 – 412.

Бугаёў, Д. Міхась Лынькоў / Дзмітрый Бугаёў // Спавядальнае слова : літаратурная крытыка, успаміны / Дзмітрый Бугаёў. – Мінск, 2001. – С. 158 – 183.

Складальнік: Андык, Н.М.

ДУК “Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка”

Аддзел маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы